ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне
Валожынскага раённага
выканаўчага камітэта
01.11.2022 № 1640

СТАТУТ
дзяржаўнай установы адукацыі
“Дорская сярэдняя школа”
(Дорская сярэдняя школа)
(новая рэдакцыя)

УСТАВ
государственного учреждения образования
«Дорская средняя школа»
(Дорская средняя школа)
(новая редакция)

а.г. Доры
2022

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Сапраўдны Статут дзяржаўнай установы адукацыі “Дорская сярэдняя школа” (далей – Установа) з’яўляецца новай рэдакцыяй Статута дзяржаўнай установы адукацыі “Дорскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа” (далей – Статут), зацверджанага рашэннем Валожынскага раённага выканаўчага камітэта 08.01.2019 № 16 і зарэгістраванага Валожынскім раённым выканаўчым камітэтам 11.01.2019, рэгістрацыйны № 690338648, у сувязі з прывядзеннем яго у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь ад 14.01.2022 № 154-З “Аб змяненні Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі”.

2. Статут рэгулюе парадак дзейнасці Установы. Установа арганізуе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, Палажэннем аб установе дашкольнай адукацыі, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Статутам.

3. Поўная назва Установы:

на беларускай мове – дзяржаўная ўстанова адукацыі “Дорская сярэдняя школа”;

на рускай мове – государственное учреждение образования «Дорская средняя школа».

Скарочаная назва Установы:

на беларускай мове – Дорская сярэдняя школа;

на рускай мове – Дорская средняя школа.

4. Месца знаходжання Установы:

вул. Савецкая, 1, 222362, аграгарадок Доры, Валожынскі раён, Мінская вобласць.

5. 01.09.2005 дзяржаўная ўстанова адукацыі “Дорская сярэдняя агульнаадукацыйная школа” і Дорскі дзіцячы сад рэарганізаваны ў дзяржаўную ўстанову адукацыі “Дорская сярэдняя агульнаадукацыйная школа – дзіцячы сад” (рашэнне Валожынскага раённага выканаўчага камітэта ад 25.08.2005 № 652/1).

03.05.2006 дзяржаўная ўстанова адукацыі “Дорская сярэдняя агульнаадукацыйная школа – дзіцячы сад” перайменавана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі “Дорскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя агульнаадукацыйная школа” (рашэнне Валожынскага раённага выканаўчага камітэта ад 03.05.2006 № 402).

01.09.2011 дзяржаўная установа адукацыі “Дорскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя агульнаадукацыйная школа” перайменавана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі “Дорскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа”

(рашэнне Валожынскага раённага выканаўчага камітэта ад 26.08.2011 № 1090).

Установа з’яўляецца правапераемнікам правоў і абавязкаў дзяржаўнай установы адукацыі “Дорскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа”.

6. Тып Установы – установа агульнай сярэдняй адукацыі, від Установы – сярэдняя школа.

7. Заснавальнікам Установы з’яўляецца Валожынскі раённы выканаўчы камітэт (далей па тэксту – Заснавальнік). Месца знаходжання Заснавальніка: пл. Свабоды, 2, 222357, г. Валожын, Мінская вобласць.

8. Органам дзяржаўнага кіравання, упаўнаважаным кіраваць маёмасцю Установы, з’яўляецца ўпраўленне па адукацыі, спорце і турызме Валожынскага раённага выканаўчага камітэта (далей па тэксту – Упаўнаважаны орган).

9. Маёмасць Установы знаходзіцца ў камунальнай уласнасці Валожынскага раёна і ў аператыўным кіраванні Упаўнаважанага органа.

10. Установа створана ў форме ўстановы на аснове дзяржаўнай уласнасці, з’яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая фінансуецца з рэспубліканскага, абласнога і раённага бюджэтаў, ствараецца, рэарганізуецца, ліквідуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, дзейнічае на падставе Статута, які зацвярджаецца Заснавальнікам у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

11. Установа з’яўляецца юрыдычнай асобай, мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і са сваёй назвай, штамп, бланк устаноўленага ўзору, можа мець разліковы і іншыя рахункі ў банках Рэспублікі Беларусь, якія адкрываюцца ва ўстаноўленым парадку.

12. Установа абслугоўваецца дзяржаўнай установай “Валожынскі раённы цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый”.

13. Установа не мае права выступаць гарантам або паручыцелем перад банкамі-крэдыторамі юрыдычных асоб недзяржаўнай формы ўласнасці і фізічных асоб па выкананні гэтымі асобамі сваіх абавязкаў вяртання атрыманых крэдытаў.

14. Установа мае права ажыццяўляць віды эканамічнай дзейнасці ў адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь ОКРБ 005-2011 “Віды эканамічнай дзейнасці”.

Віды дзейнасці, якія падлягаюць ліцэнзіраванню, ажыццяўляюцца Установай пасля атрымання адпаведнай ліцэнзіі.

15. Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) на адукацыйную дзейнасць, дзяржаўная акрэдытацыя на адпаведнасць заяўленаму віду, пацвярджэнне дзяржаўнай акрэдытацыі ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі заканадаўчымі актамі.

16. Статут абавязковы для выканання педагагічнымі і іншымі работнікамі Установы, навучэнцамі і выхаванцамі, а таксама іх законнымі прадстаўнікамі.

17. Змяненні і дапаўненні ў Статут уносяцца пасля іх зацвярджэння Заснавальнікам у парадку, устаноўленым дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

18. Дакументацыя Установы вядзецца на дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь.

19. Установа нясе ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку адказнасць за невыкананне або неналежнае выкананне функцый, аднесеных да кампетэнцыі Установы.

## ГЛАВА 2
## ПРАДМЕТ, МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ДЗЕЙНАСЦІ УСТАНОВЫ

20. Прадметам дзейнасці Установы з’яўляецца ажыццяўленне ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь адукацыйнай дзейнасці, якая ўключае ў сябе арганізацыю і правядзенне вучэбнай, выхаваўчай і метадычнай работы.

21. Ва Установе рэалізуецца адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі, адукацыйная праграма пачатковай адукацыі, адукацыйная праграма базавай адукацыі, адукацыйная праграма сярэдняй адукацыі, адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйная праграма спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграма выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі, праграма выхавання і абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

22. Асноўнай мэтай дзейнасці Установы з’яўляецца забеспячэнне права навучэнцаў на атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі з улікам іх індывідуальных запатрабаванняў, схільнасцей і запытаў, стварэнне ўмоў для развіцця іх творчага, інтэлектуальнага патэнцыялу, усвядомленага прафесійнага самавызначэння далейшай адукацыі і працоўнай дзейнасці.

23. Установа рэалізуе наступныя задачы:

забеспячэнне якасці адукацыі;

развіццё інфармацыйнай прасторы Установы для выхаванцаў,

навучэнцаў, педагогаў, соцыума;

стварэнне бяспечных умоў, здароўезберагаючага асяроддзя для выхавання фізічна здаровай, духоўна багатай, высокамаральнай асобы;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі развіцця і аказанне гэтым асобам карэкцыйна-педагагічнай дапамогі;

развіццё асобы навучэнца і выхаванца, іх здольнасцей і схільнасцей;

забеспячэнне інтэлектуальнага, асобаснага і фізічнага развіцця навучэнцаў і выхаванцаў;

стварэнне ўмоў для фізічнага ўдасканалення, авалодання ведамі, каштоўнасцямі і навыкамі здаровага ладу жыцця;

стварэнне ўмоў для фарміравання грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі;

падрыхтоўка навучэнцаў да свядомага прафесійнага самавызначэння, працягу навучання, працоўнай і грамадскай дзейнасці;

забеспячэнне сацыяльнай абароны навучэнцаў і выхаванцаў і ўстаноўленых заканадаўствам сацыяльных гарантый;

садзеянне дзейнасці дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб’яднанняў;

стварэнне неабходных умоў для арганізацыі харчавання навучэнцаў і выхаванцаў;

павышэнне прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў па пытаннях сучаснага зместу адукацыі;

узаемадзеянне з установамі адукацыі, спорту, аховы здароўя і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі і грамадскімі аб’яднаннямі;

удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння адукацыйнага працэсу.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК КІРАЎНІЦТВА ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ, СТРУКТУРА І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ ОРГАНАЎ КІРАВАННЯ І САМАКІРАВАННЯ

24. Кіраванне Установай ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, Палажэннем аб установе дашкольнай адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, дадзеным Статутам і будуецца на прынцыпах адзінаначалля, галоснасці і самакіравання.

25. Установу ўзначальвае дырэктар, які ажыццяўляе непасрэднае кіраванне адукацыйным працэсам і бягучай дзейнасцю Установы. Дырэктар мае намеснікаў па асноўнай дзейнасці.

26. Дырэктар назначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Упаўнаважаным органам па ўзгадненні з Валожынскім раённым выканаўчым камітэтам, галоўным упраўленнем па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

27. Намеснікі дырэктара Установы назначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады загадам дырэктара Установы па ўзгадненні з Упаўнаважаным органам.

28. Дырэктар Установы дзейнічае ад імя Установы без даверанасці і нясе адказнасць за вынікі сваёй дзейнасці.

29. Дырэктар Установы ажыццяўляе кантроль за ходам і вынікамі адукацыйнага працэсу; прымае на работу і звальняе ва ўстаноўленым парадку педагагічных і іншых работнікаў Установы; зацвярджае іх далжнасныя і рабочыя інструкцыі; размяркоўвае і нясе адказнасць за ўстанаўленне нагрузкі педагагічным работнікам; заключае дагаворы з арганізацыямі і фізічнымі асобамі, у тым ліку з навучэнцамі Установы, на выкананне розных відаў работ па бягучым рамонце Установы, дагаворы на аказанне дадатковых адукацыйных паслуг; выдае загады і ўказанні, абавязковыя для выканання ўсімі работнікамі Установы.

30. Дырэктар нясе адказнасць за якасць і эфектыўнасць работы, ахову правоў, жыцця і здароўя дзяцей, стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу, дзейнасць і вынік работы ў адпаведнасці з функцыянальнымі абавязкамі, прадугледжанымі кваліфікацыйнымі патрабаваннямі і Статутам Установы.

31. Дырэктар Установы ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, устаноўленыя Грамадзянскім Кодэксам Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі актамі заканадаўства.

32. Аплата працы дырэктара Установы, у тым ліку яго заахвочванне па выніках работы, ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

33. Абавязкі дырэктара Установы зацвярджае Упаўнаважаны орган.

34. Дырэктар Установы ў сваёй дзейнасці ўзаемадзейнічае з органамі самакіравання Установы.

35. Асноўным органам самакіравання Установы з'яўляецца педагагічны савет, які ўзначальвае дырэктар.

36. Дзейнасць педагагічнага савета ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб педагагічным савеце, якое зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі.

Педагагічны савет ажыццяўляе сваю работу ў форме пасяджэнняў, якія склікаюцца не радзей аднаго разу ў чвэрць у адпаведнасці з планам работы ці па меры неабходнасці для вырашэння пытанняў, якія адносяцца да кампетэнцыі педагагічнага савета.

Пасяджэнні педагагічнага савета лічацца паўнамоцнымі, калі на іх прысутнічае не менш двух трэціх членаў педагагічнага савета.

Рашэнні педагагічнага савета пасля зацвярджэння іх загадам дырэктара, з'яўляюцца абавязковымі для выканання ўсімі педагагічнымі работнікамі і навучэнцамі ўстановы.

37. Ва Установе па меры неабходнасці могуць ствараццa наступныя органы самакіравання: савет, метадычны савет, папячыцельскі савет, бацькоўскі камітэт, вучнёўскі савет.

38. Кампетэнцыя, абавязкі і адказнасць Установы вызначаюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі заканадаўчымі і прававымі актамі дзяржаўных органаў, якія рэгулююць адносіны ў галіне адукацыі.

39. Ва Установе не дапускаецца стварэнне і дзейнасць палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць палітычныя мэты, а таксама іншых аб'яднанняў і арганізацый (у тым ліку рэлігійных), дзейнасць якіх супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

40. Справаводства ва Установе вядзецца ў парадку, вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Наменклатура спраў Установы зацвярджаецца дырэктарам Установы на каляндарны год.

## ГЛАВА 4
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ВА УСТАНОВЕ

41. Адукацыйны працэс ва Установе будуецца на аснове прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі і педагагічна абгрунтаваным выбары зместу дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі, форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання з улікам дасягненняў сацыяльнага і навукова-тэхнічнага прагрэсу, нацыянальна-культурных і агульначалавечых каштоўнасцей, патрэб асобы, дзяржавы і грамадства.

42. Арганізацыя адукацыйнага працэсу ва Установе ажыццяўляецца ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі, а таксама тыпавым вучэбным планам і вучэбнымі праграмамі, распрацаванымі і зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

43. Установа кожны год распрацоўвае на аснове тыпавых вучэбных планаў уласныя вучэбныя планы, якія зацвярджаюцца дырэктарам і ўзгадняюцца з Заснавальнікам. Праграмы аб'яднанняў па інтарэсах распрацоўваюцца на аснове тыпавых праграм.

44. Навучанне ва Установе ажыццяўляецца на беларускай мове, выхаванне – на беларускай і рускай мовах. Вывучэнне рускай мовы з першага класа і замежнай мовы з трэцяга класа з'яўляецца абавязковым, за выключэннем асобных катэгорый дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

45. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі праграмы дашкольнай адукацыі здзяйсняецца на працягу ўсяго года.

46. Час знаходжання выхаванцаў ва Установе пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі вызначаецца Заснавальнікам у адпаведнасці з запытамі законных прадстаўнікоў і можа складаць ад 2 да 7 гадзін, 10,5 гадзін, 12 гадзін.

Час знаходжання выхаванца ва Установе па жаданні яго законных прадстаўнікоў можа быць зменшаны.

47. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца ў групах, групах інтэграванага навучання і выхавання і групах сумеснага навучання.

48. Групы інтэграванага навучання і выхавання – групы, у якіх рэалізуецца адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі і адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі. Групы інтэграванага навучання і выхавання ствараюцца для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 7 гадоў.

49. Напаўняльнасць груп устанаўліваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

50. Агульная працягласць канікул выхаванцаў устаноўлена Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі дакументамі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

51. Адукацыйны працэс у дашкольных групах арганізуецца ў рэжыме 5-дзённага вучэбнага тыдня. Колькасць заняткаў (гульняў) у дашкольных групах на кожны дзень вызначаецца вучэбным планам.

52. Асноўнымі формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу ў дашкольных групах з'яўляюцца гульня, занятак. Акрамя асноўных формаў могуць быць выкарыстаны іншыя формы: экскурсія, назіранне.

Арганізацыя адукацыйнага працэсу ўключае аптымальнае чаргаванне відаў дзіцячай дзейнасці.

53. Змест вучэбнай праграмы прадстаўлены базавым кампанентам. З улікам мэт і задач змест вучэбнай праграмы структураваны па пяці накірунках: фізічнае, сацыяльна-маральнае і асобаснае, пазнавальнае, маўленчае, эстэтычнае развіццё выхаванца. Кожны напрамак прадстаўлены адукацыйнымі абласцямі, якія ў адзінстве складаюць яго комплексную характарыстыку.

54. Камплектаванне дашкольных груп і перавод дзяцей з адной узроставай групы ў другую ажыццяўляецца кожны год на пачатак навучальнага года.

55. Прыём дзяцей у дашкольныя групы Установы ажыццяўляецца на працягу каляндарнага года пры наяўнасці ў іх свабодных месцаў.

56. Агульная сярэдняя адукацыя ўключае тры ступені:
I ступень – пачатковая адукацыя (I-IV класы);
II ступень – базавая адукацыя (V-IX класы);

III ступень – сярэдняя адукацыя (X-XI класы).

57. Тэрмін атрымання агульнай базавай адукацыі складае дзевяць гадоў; агульнай сярэдняй адукацыі – адзінаццаць гадоў.

58. Тэрмін навучання на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі складае:

на I ступені – чатыры гады;

на II ступені – пяць гадоў;

на III ступені – два гады.

59. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца па гадах. Навучальны год дзеліцца на чвэрці.

60. Для навучэнцаў устанаўліваюцца канікулы на працягу навучальнага года. Агульная працягласць канікул устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

61. Адукацыйны працэс пры навучанні і выхаванні на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца ў рэжыме шасцідзённага школьнага тыдня, які ўключае пяцідзённы вучэбны тыдзень і адзін дзень тыдня (субота) для правядзення з навучэнцамі спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых, іншых выхаваўчых мерапрыемстваў, экскурсій, грамадска карыснай працы і прафесійнай падрыхтоўкі.

62. Вывучэнне вучэбных прадметаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм базавай адукацыі і адукацыйных праграм сярэдняй адукацыі можа ажыццяўляцца на базавым і павышаным узроўнях.

Базавы ўзровень вывучэння вучэбнага прадмета, модуля – вывучэнне зместу адпаведнага вучэбнага прадмета, модуля, якое з’яўляецца абавязковым у адпаведнасці з вучэбнай праграмай па гэтаму вучэбнаму прадмету, модулю.

Павышаны ўзровень вывучэння вучэбнага прадмета, модуля – вывучэнне зместу адпаведнага вучэбнага прадмета, модуля, якое ўключае ў сябе базавы ўзровень вывучэння гэтага вучэбнага прадмета, модуля з паглыбленнем і (або) пашырэннем яго зместу.

63. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца вучэбны занятак: урок, назіранне, вучэбнае праектаванне, экскурсія, вучэбна-палявыя зборы і іншыя вучэбныя заняткі. Дадаткова праводзяцца факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі, кансультацыі, карэкцыйныя заняткі, практычныя заняткі, грамадска карысная праца. Вучэбныя і іншыя заняткі могуць праводзіцца па зменах.

64. Факультатыўныя заняткі, як правіла, праводзяцца перад пачаткам або пасля заканчэння ўрокаў. У V-XI класах факультатыўныя заняткі могуць праводзіцца ў шосты школьны дзень.

65. Для навучэнцаў і выхаванцаў Установы могуць быць арганізаваны аб’яднанні па інтарэсах.

66. Для правядзення заняткаў навучэнцы загадам дырэктара Установы аб’ядноўваюцца ў класы. Класы могуць дзяліцца на групы ў выпадках і парадку, устаноўленых Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Напаўняльнасць класаў вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

67. Працягласць урокаў у I класе – 35 хвілін, у II-XI класах – 45 хвілін.

68. Колькасць вучэбных заняткаў на кожны дзень вызначаецца раскладам урокаў, які зацвярджаецца дырэктарам Установы.

69. Не дапускаецца адцягненне навучэнцаў ад вучэбных заняткаў на работы і мерапрыемствы, не звязаныя з адукацыйным працэсам. Забараняецца прыцягненне навучэнцаў Установы да выканання работ (аказання паслуг), не прадугледжаных вучэбна-праграмнай дакументацыяй, планам выхаваўчай работы Установы, праграмамі выхавання.

70. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ажыццяўляецца ў аб’яднаннях па інтарэсах, якія фарміруюцца загадам дырэктара Установы ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

71. Форма атрымання адукацыі – вочная.

72. Навучанне дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і дзяцей-інвалідаў можа ажыццяўляцца ва Установе або дома па індывідуальных праграмах у адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі Рэспублікі Беларусь.

73. Атрыманне дашкольнай або агульнай сярэдняй адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ўключае ў сябе аказанне ім карэкцыйна-педагагічнай дапамогі.

Карэкцыйна-педагагічная дапамога – сістэма педагагічных мерапрыемстваў, якія арганізуюцца для дзяцей, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі і маюць устойлівыя або часовыя цяжкасці ў іх засваенні. Карэкцыйна-педагагічная дапамога аказваецца ў пункце карэкцыйна-педагагічнай дапамогі. Палажэнне аб пункце карэкцыйна-педагагічнай дапамогі зацверджана Міністрэствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

74. Для навучэнцаў, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць Установу, ствараюцца ўмовы для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльнай адукацыі дома. Пералік медыцынскіх паказанняў вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Рашэнне аб атрыманні агульнай сярэдняй

адукацыі дома прымаецца Упаўнаважаным органам на падставе заявы законнага прадстаўніка навучэнца і заключэння медыка-кансультацыйнай камісіі, аб атрыманні спецыяльнай адукацыі дома – Упаўнаважаным органам на аснове заявы навучэнца (законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца або выхаванца), заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, а таксама заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

Парадак арганізацыі засваення зместу адукацыйных праграм дома вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя.

75. Для аказання дапамогі сем’ям ў навучанні і выхаванні дзяцей, стварэння ўмоў для развіцця іх творчых здольнасцей могуць адкрывацца групы падоўжанага дня для навучэнцаў I-IX класаў на аснове палажэння, зацверджанага Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

76. Асноўнымі накірункамі выхавання ва Установе з’яўляюцца:

грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры;

ідэалагічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў ведаў асноў дзяржаўнай ідэалогіі, прывіццё падрастаючаму пакаленню агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцей, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць сутнасць беларускай дзяржаўнасці;

духоўна-маральнае выхаванне, накіраванае на далучэнне навучэнцаў да агульначалавечых і гуманістычных каштоўнасцей, фарміраванне маральнай культуры;

эстэтычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў эстэтычнага густу, развіццё пачуцця прыгожага;

выхаванне псіхалагічнай культуры, накіраванай на развіццё і самаразвіццё асобы навучэнца;

выхаванне фізічнай культуры, фізічнае ўдасканаленне;

фарміраванне ў навучэнцаў навыкаў здаровага ладу жыцця, усведамленне значнасці здароўя як каштоўнасці і важнасці яго захавання;

сямейнае і гендэрнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў адказнага стаўлення да сям’і, шлюбу, выхавання дзяцей, усвядомленых уяўленняў аб ролі і жыццёвым прызначэнні мужчын і жанчын у сучасным грамадстве;

працоўнае і прафесійнае выхаванне, накіраванае на разуменне навучэнцамі працы як асобаснай і сацыяльнай каштоўнасці, гатоўнасці да ўсвядомленага прафесійнага выбару;

выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання;

выхаванне культуры бяспекі жыццядзейнасці, накіраванае

на фарміраванне ў навучэнцаў бяспечных паводзін у сацыяльнай і прафесійнай дзейнасці;

выхаванне культуры побыту і вольнага часу, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў каштоўнасных адносін да матэрыяльнага асяроддзя, уменні мэтазгодна і эфектыўна выкарыстоўваць вольны час;

полікультурнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне талерантнага стаўлення да прадстаўнікоў іншых культур, нацыянальнасцей, веравызнанняў;

эканамічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне эканамічнай культуры асобы.

77. Выхаванне ва Установе ажыццяўляецца на навучальных занятках і ў працэсе выхаваўчай работы ў пазаўрочны час. Выхаваўчая работа з вучнямі праводзіцца педагагічнымі работнікамі.

78. Установа пры арганізацыі выхавання выкарыстоўвае актыўныя формы работы з навучэнцамі і іх законнымі прадстаўнікамі, у тым ліку інтэлектуальныя конкурсы, канферэнцыі, выставы творчасці навучэнцаў, гульнёвыя праграмы, тэматычныя дыскатэкі, спартыўна-аздараўленчыя гульні, клубную работу і іншыя.

79. Ва Установе могуць ствараццa пярвічныя арганізацыі грамадскага аб’яднання “Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя”, грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” і іншыя дзіцячыя і дарослыя грамадскія арганізацыі і аб’яднанні, дзейнасць якіх дазволена ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, і садзейнічае ўдасканаленню якасці навучання і выхавання. Яны працуюць у адпаведнасці са сваімі Статутамі і палажэннямі, якія не павінны супярэчыць дзеючаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь і Статуту Установы.

80. Установа забяспечвае ўдзел навучэнцаў у аб’яднаннях па інтарэсах, да якіх адносяцца гурток, клуб, секцыя, студыя, майстэрня, навуковае таварыства навучэнцаў і іншыя аб’яднанні. Аб’яднанні па інтарэсах могуць быць аднаўзроставымі і рознаўзроставымі і ствараццa для працы з пераменным складам навучэнцаў.

81. Ва Установе можа ствараццa сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная служба з мэтай выяўлення і развіцця інтарэсаў і здольнасцей навучэнцаў, іх прафесійных схільнасцей, правядзення псіхолага-педагагічных кансультацый для навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў, вывучэння псіхалагічнага мікраклімату ў класных калектывах і іншых патрэб.

Парадак стварэння і работы сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы вызначаецца Палажэннем, зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

82. Ва Установе стварaецца савет па прафілактыцы безнагляднасці

і правапарушэнняў непаўналетніх, які садзейнічае арганізацыі дзейнасці па пытаннях прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, а таксама арганізацыі кантролю за ажыццяўленнем выхаваўчай і прафілактычнай работы ва Установе.

Парадак стварэння савета, яго задачы і функцыі, парадак арганізацыі яго работы вызначаюцца Палажэннем, зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

83. Ва Установе прадугледжваецца абавязковае гарачае харчаванне для навучэнцаў і выхаванцаў, якое арганізоўваецца ў адпаведнасці з нормамі харчавання дзяцей, зацверджанымі пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, па графіку, зацверджанаму дырэктарам Установы.

84. У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь на аснове вышэйназваных нормаў харчавання зацвярджаюцца грашовыя нормы харчавання дзяцей у залежнасці ад іх узросту і працягласці знаходжання ва Установе.

85. Медыцынскае абслугоўванне дзяцей Установы ажыццяўляецца Дорскім фельдшарска-акушэрскім пунктам і Пяршайскай урачэбнай амбулаторыяй, якія забяспечваюць кантроль за станам здароўя дзяцей, ажыццяўляюць правядзенне лячэбна-прафілактычных і аздараўленчых мерапрыемстваў, кантроль выканання патрабаванняў санітарных правілаў і нормаў у частцы арганізацыі адукацыйнага працэсу, удзельнічаюць у гігіенічным выхаванні і фарміраванні навыкаў здаровага ладу жыцця.

86. Парадак знаходжання навучэнцаў ва Установе вызначаецца правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, якія зацверджаны дырэктарам Установы.

87. Прапускны рэжым ва Установе ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб арганізацыі прапускнога рэжыму, якая зацвярджаецца дырэктарам, і прадугледжвае:

устанаўленне работнікам Установы рэжыму рабочага часу, які вызначаецца правіламі ўнутранага працоўнага распарадку або графікам работ (зменнасці);

прыняцце правіл унутранага распарадку для навучэнцаў;

вызначэнне парадку доступу ў памяшканне Установы работнікаў, навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў, службовых асоб, якія абслугоўваюць Установу, іншых наведвальнікаў;

вызначэнне пераліку прадметаў і рэчываў, забароненых да захоўвання і выкарыстання навучэнцамі ў перыяд знаходжання ва Установе;

агароджу, асвятленне і абазначэнне месцаў, небяспечных для здароўя і жыцця людзей.

# ГЛАВА 5
# ПАРАДАК ПРЫЁМУ, ПЕРАВОДУ, ВЫПУСКУ НАВУЧЭНЦАЎ І ВЫХАВАНЦАЎ

88. Прыём асоб для атрымання дашкольнай адукацыі здзяйсняецца на падставе заявы законнага прадстаўніка, медыцынскай даведкі аб стане здароўя, накіравання Упаўнаважанага органа.

89. Парадак пастаноўкі на ўлік дзяцей, якім неабходна атрыманне дашкольнай адукацыі ва ўстанове адукацыі, вызначаецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Урадам Рэспублікі Беларусь.

90. Прыём асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковага навучання ажыццяўляецца па дасягненні гэтымі асобамі на пачатак навучальнага года ўзросту шасці гадоў або па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы з больш позняга ўзросту. Па заяве аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы пры наяўнасці рашэння педагагічнага савета дапускаецца прыём (залічэнне) ў 1 клас асобы, якой шэсць гадоў спаўняецца ў бягучым каляндарным годзе.

91. Прыём (залічэнне) асобы, якая дасягнула ўзросту чатырнаццаці гадоў, ва Установу для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на падставе яе заявы і са згоды аднаго з яе законных прадстаўнікоў пры прад'яўленні пасведчання аб нараджэнні або дакумента, пацвярджаючага асобу, медыцынскай даведкі аб стане здароўя, даведкі аб навучанні або пасведчання аб агульнай базавай адукацыі для навучэнцаў пры прыёме ў X клас. Ад імя непаўналетняга заява можа быць пададзена яго законным прадстаўніком.

92. Вучні I-VIII класаў, якія маюць станоўчыя гадавыя адзнакі, пасля завяршэння навучальнага года пераводзяцца ў наступны клас на падставе рашэння педагагічнага савета Установы.

Навучэнцы X класа, якія маюць станоўчыя гадавыя адзнакі, пераводзяцца ў наступны клас пасля праходжання абавязковага 5-дзённага вучэбна-палявога збору (медыцынскай практыкі) на падставе рашэння педагагічнага савета Установы.

93. Атэстацыя навучэнцаў Установы вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

94. Атэстацыя навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.

95. Атэстацыя навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця

пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

96. Навучэнцам Установы, якія засвоілі змест адукацыйных праграм і паспяхова прайшлі выніковую атэстацыю, выдаецца дакумент аб адукацыі:

навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, – пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі (пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай);

навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, – атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі (атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі асаблівага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём).

97. Пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай, атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі асаблівага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём выдаюцца навучэнцам у парадку, які вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

98. Пры выдачы атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы па рашэнні дырэктара Установы могуць быць узнагароджаны пахвальнымі лістамі.

99. Навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю і паспяхова прайшлі выніковую атэстацыю, выдаецца пасведчанне аб спецыяльнай адукацыі.

100. Навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) у рамках вывучэння вучэбнага прадмета “Працоўнае навучанне” на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі і паспяхова здалі кваліфікацыйны экзамен па адпаведнай прафесіі рабочага (пасады служачага), выдаецца пасведчанне аб прысваенні кваліфікацыйнага разраду (класа, катэгорыі) па прафесіі.

101. Навучэнцам, якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйных праграм, пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні) выдаецца даведка ў парадку, які ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

102. Адлічэнне навучэнцаў з Установы ажыццяўляецца на падставе

заявы законных прадстаўнікоў навучэнцаў з указаннем прычыны, загадам па Установе.

103. Рашэнне аб адлічэнні дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, іншых законных прадстаўнікоў, можа быць прынята толькі пасля ўзгаднення з органам апекі і папячыцельства.

## ГЛАВА 6
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ УСТАНОВЫ

104. Установа ў адпаведнасці з ускладзенымі на яе асноўнымі задачамі мае правы:

ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць;

ажыццяўляць праверку сапраўднасці дакумента аб адукацыі (пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі) шляхам накіравання запыту ў Міністэрства адукацыі аб падцвярджэнні факта яго выдачы ў выпадку ўзнікнення сумненняў ў сапраўднасці дакумента аб адукацыі;

фарміраваць структуру і штатны расклад;

ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы;

удзельнічаць у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі;

уваходзіць у склад асацыяцый (саюзаў) і іншых аб’яднанняў некамерцыйных арганізацый;

ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі.

105. Установа павінна забяспечваць:

якасць прадастаўляемай адукацыі;

падбор, прыём на работу і расстаноўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі;

выкананне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў;

распрацоўку і прыняцце правілаў унутранага распарадку для работнікаў і для навучэнцаў;

маральнае і матэрыяльнае стымуляванне навучэнцаў, педагагічных і іншых работнікаў Установы;

меры сацыяльнай абароны дзяцей;

стварэнне неабходных умоў для харчавання і аказання медыцынскай дапамогі;

кантроль за працаўладкаваннем непаўналетніх выпускнікоў Установы;

азнаямленне асоб, законных прадстаўнікоў непаўналетніх асоб пры прыёме (залічэнні) ва Установу з пасведчаннем аб дзяржаўнай

рэгістрацыі, сертыфікатам аб дзяржаўнай акрэдытацыі, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) на адукацыйную дзейнасць, Статутам, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, іншымі лакальнымі прававымі актамі Установы, якія ўтрымліваюць правы і абавязкі навучэнцаў, а па іх патрабаванні – таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

атрыманне законнымі прадстаўнікамі непаўналетніх інфармацыі аб ходзе і змесце адукацыйнага працэсу, выкарыстоўваемых метадах навучання і выхавання, рэзультатах вучэбнай дзейнасці, а таксама інфармацыі аб усіх відах абследванняў (медыцынскіх, псіхалагічных, педагагічных) навучэнцаў і выхаванцаў;

патранат асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на працягу двух гадоў пасля атрымання адукацыі ва Установе ў адпаведнасці з Палажэннем аб патранаце асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якое зацверджана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь;

садзейнічанне ўпаўнаважаным дзяржаўным органам у правядзенні кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі.

106. Іншыя правы і абавязкі Установы ўстанаўліваюцца дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і Статутам.

107. Установа нясе ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку адказнасць за:

парушэнне патрабаванняў да арганізацыі і ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці;

рэалізацыю не ў поўным аб’ёме адукацыйных праграм дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі;

жыццё і здароўе навучэнцаў і выхаванцаў, педагагічных і іншых работнікаў установы ў час адукацыйнага працэсу;

парушэнне або незаконнае абмежаванне права на адукацыю і прадугледжаных заканадаўствам аб адукацыі праў і свабод навучэнцаў і выхаванцаў, законных прадстаўнікоў непаўналетніх.

## ГЛАВА 7
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ УДЗЕЛЬНІКАЎ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ І ІНШЫХ РАБОТНІКАЎ

108. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу ва Установе з’яўляюцца навучэнцы, выхаванцы, педагагічныя работнікі, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў.

109. Навучэнцы маюць права на:

атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі;

перавод у іншую ўстанову адукацыі ў парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь;

навучанне па індывідуальным вучэбным плане ў межах зместу

адукацыйнай праграмы;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцяў іх псіхафізічнага развіцця;

павагу чалавечай годнасці, абарону ад усіх форм фізічнага і псіхічнага насілля, абразы асобы, ахову жыцця і здароўя падчас адукацыйнага працэсу;

бясплатнае псіхолага-медыка-педагагічнае абследаванне ў дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі;

карыстанне падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі ў адпаведнасці з заканадаўствам;

бясплатнае карыстанне інфармацыйнымі рэсурсамі вучэбнай, вытворчай, навуковай і фізкультурна-спартыўнай базай Установы;

атрыманне сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай дапамогі з боку спецыялістаў устаноў адукацыі;

заахвочванне за поспехі ў вучэбнай, спартыўна-масавай, грамадскай, навуковай дзейнасці, а таксама ў адукацыйных мерапрыемствах;

удзел у кіраванні Установай;

удзел у алімпіядах, конкурсах, турнірах, фестывалях, канферэнцыях, сімпозіумах, семінарах і іншых адукацыйных мерапрыемствах, спартыўна-масавай дзейнасці.

Іншыя правы навучэнцаў устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, лакальнымі прававымі актамі Установы.

110. Навучэнцы абавязаны:

выконваць патрабаванні Статута;

выконваць рашэнні педагагічнага савета, іншых органаў самакіравання Установы, Правілы ўнутранага распарадку для навучэнцаў, патрабаванні кіраўніцтва і педагагічных работнікаў;

добрасумленна і адказна ставіцца да засваення зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання;

клапаціцца аб сваім здароўі, імкнуцца да маральнага, духоўнага і фізічнага развіцця і самаўдасканалення;

паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу, работнікаў Установы;

не дапускаць дзеянняў, якія перашкаджаюць іншым удзельнікам адукацыйнага працэсу выконваць іх абавязкі і рэалізоўваць іх правы ў сферы адукацыі;

беражліва ставіцца да маёмасці Установы.

Іншыя абавязкі навучэнцаў устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, лакальнымі прававымі актамі Установы.

111. За супрацьпраўнае, віноўнае (наўмыснае

або па неасцярожнасці) невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў, якія ўскладзены на навучэнца актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы, навучэнец можа быць прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці (заўвага, вымова, адлічэнне). Тэрміны, аснова і парадак прыцягнення навучэнца да дысцыплінарнай адказнасці вызначаюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

112. Педагагічныя работнікі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства маюць правы на:

абарону прафесійнага гонару і годнасці;

забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

творчую ініцыятыву, свабоду выбару педагагічна абгрунтаваных формаў і метадаў навучання і выхавання, навучальных выданняў і сродкаў навучання;

доступ да вучэбна-праграмнай, вучэбна-метадычнай дакументацыі, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў;

удзел у абнаўленні, распрацоўцы і вызначэнні структуры і зместу структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі;

удзел у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай, міжнароднай дзейнасці Установы;

удзел у кіраванні Установай;

павышэнне кваліфікацыі;

маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай дзейнасці;

аб’яднанне ў прафесійныя саюзы, іншыя грамадскія аб’яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

штомесячную кампенсацыю расходаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь;

бясплатную перавозку да месца працы (да Установы) і назад школьным аўтобусам па маршруце іх руху ў выпадку адсутнасці аўтамабільных перавозак пасажыраў грамадскім транспартам, які забяспечвае прыбыццё педагагічнага работніка да пачатку яго рабочага дня да месца працы і назад, і пры наяўнасці свабодных пасадачных месцаў у школьным аўтобусе.

Іншыя правы педагагічных работнікаў устанаўліваюцца актамі заканадаўства, іншымі лакальнымі прававымі актамі Установы.

113. У мэтах урэгулявання рознагалоссяў паміж удзельнікамі адукацыйных адносін у выпадку ўзнікнення канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ва Установе ствараецца камісія па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка.

Парадак стварэння, арганізацыі работы, прыняцця рашэнняў

камісіяй па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка і іх выкананне ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

114. Педагагічныя работнікі абавязаны:

ажыццяўляць сваю дзейнасць на прафесійным узроўні, які забяспечвае рэалізацыю адукацыйных праграм, праграм выхавання;

выконваць прававыя, маральныя і этычныя нормы;

паважаць гонар і годнасць навучэнцаў і выхаванцаў, іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

павышаць свой прафесійны ўзровень, праходзіць атэстацыю;

весці здаровы лад жыцця, прапагандаваць яго сярод навучэнцаў;

выконваць спецыяльныя ўмовы, неабходныя для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

праходзіць папярэдні медыцынскі агляд пры паступленні на працу і перыядычныя медыцынскія агляды ў парадку, які ўстанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Педагагічныя работнікі нясуць адказнасць за стварэнне здаровых і бяспечных умоў для навучэнцаў і выхаванцаў у час правядзення заняткаў, экскурсій, паходаў, спартыўных гульняў і спаборніцтваў, грамадска карыснай працы, работы груп падоўжанага дня, выхаваўчых мерапрыемстваў.

Педагагічным работнікам забараняецца выкарыстоўваць адукацыйны і выхаваўчы працэсы ў палітычных мэтах або для прымушэння навучэнцаў да дзеянняў, якія супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і заканадаўству.

Іншыя абавязкі педагагічных работнікаў устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, лакальнымі прававымі актамі Установы.

115. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх маюць права на:

азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, іншымі лакальнымі прававымі актамі, у якіх акрэслены правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

удзельнічаць у кіраванні Установай;

абарону правоў і законных інтарэсаў навучэнцаў, уключаючы зварот у камісію па вырашэнні канфліктаў інтарэсаў педагагічнага работніка ў выпадку ўзнікнення спрэчак паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу;

атрыманне інфармацыі аб ходзе і змесце адукацыйнага працэсу, метадах, якія выкарыстоўваюцца ў навучанні і выхаванні, выніках вучэбнай дзейнасці навучэнцаў і выхаванцаў у парадку, прадугледжаным кіраўніком Установы;

атрыманне інфармацыі аб усіх відах абследванняў (медыцынскіх, псіхалагічных, педагагічных) навучэнцаў і выхаванцаў.

Іншыя правы законных прадстаўнікоў непаўналетніх устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, лакальнымі прававымі актамі Установы.

116. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў абавязаны:

забяспечваць неабходныя ўмовы для атрымання адукацыі і развіцця навучэнцаў і выхаванцаў;

паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

забяспечваць выкананне навучэнцамі, законнымі прадстаўнікамі якіх яны з'яўляюцца, патрабаванняў установучых дакументаў, правілаў унутраннага распарадку для навучэнцаў.

суправаджаць непаўналетніх, законнымі прадстаўнікамі якіх яны з'яўляюцца, якія не дасягнулі ўзросту шаснаццаці гадоў, у перыяд з дваццаці трох да шасці гадзін па-за жыллём або забяспечваць іх суправаджэнне паўналетнімі асобамі;

Іншыя абавязкі законных прадстаўнікоў непаўналетніх устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, лакальнымі прававымі актамі Установы.

117. Да іншых работнікаў Установы адносяцца работнікі, якія не з'яўляюцца педагагічнымі работнікамі.

118. Правы і абавязкі іншых работнікаў Установы вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, правіламі ўнутранага працоўнага распарадку, іншымі лакальнымі нарматыўнымі актамі Установы, заключанымі з імі працоўнымі дагаворамі.

## ГЛАВА 8
## ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ ШТАТАЎ І АПЛАТА ПРАЦЫ РАБОТНІКАЎ УСТАНОВЫ

119. Працоўныя адносіны работнікаў ва Установе рэгулююцца працоўнымі дагаворамі (кантрактамі), якія заключаюцца ў адпаведнасці з працоўным заканадаўствам, калектыўным дагаворам, правіламі ўнутранага працоўнага распарадку, Статутам.

120. Прыём на працу ва Установу педагагічных кадраў, іншых работнікаў ажыццяўляе дырэктар па ўзгадненні з Упаўнаважаным органам.

121. На педагагічную работу прымаюцца асобы, якія маюць неабходную прафесійную адукацыю, што пацвярджаецца адпаведным дакументам. Кваліфікацыйныя патрабаванні да педагагічных работнікаў вызначаюцца адпаведнымі кваліфікацыйнымі характарыстыкамі.

122. Да педагагічнай дзейнасці не дапускаюцца асобы, якім дадзеная

дзейнасць забаронена рашэннем суда або па медыцынскіх паказаннях, а таксама асобы, якія былі асуджаны за пэўныя злачынствы. Пералік адпаведных медыцынскіх супрацьпаказанняў і склад злачынстваў вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

123. Штатны расклад Установы зацвярджаецца дырэктарам і ўзгадняецца з Упаўнаважаным органам на аснове тыпавых штатных нарматываў, якія зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, у межах сродкаў, выдзеленых на аплату працы.

124. Аплата працы работнікаў Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, дзеючымі ва Установе палажэннямі аб прэміраванні, матэрыяльным стымуляванні, аб надбаўках і даплатах.

125. Атэстацыя педагагічных работнікаў Установы ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 9
## КРЫНІЦЫ І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ МАЁМАСЦІ УСТАНОВЫ

126. Маёмасць Установы складаюць зямельны ўчастак, будынак і памяшканні, інжынерныя камунікацыі, абсталяванне і іншая маёмасць, якая выкарыстоўваецца для навучання, выхавання, аздараўлення навучэнцаў і выхаванцаў і для вырашэння іншых задач у сферы адукацыі. Маёмасць Установы складаюць асноўныя фонды і абаротныя сродкі, а таксама іншыя матэрыяльныя каштоўнасці.

127. Установа не мае права без згоды Заснавальніка адчужаць або іншым спосабам распараджацца замацаванай за ёй маёмасцю і маёмасцю, якая набыта за сродкі, выдзеленыя ёй па каштарысу.

128. Установа для арганізацыі адукацыйнага працэсу можа выкарыстоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу іншых арганізацый у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

129. Фінансаванне Установы ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага, абласнога і раённага бюджэтаў на аснове дзяржаўных і мясцовых нарматываў фінансавання, вызначаных у разліку на аднаго навучэнца для дадзенага тыпу і віду ўстановы адукацыі.

130. Прыцягненне Установай дадатковых сродкаў не ўплывае на нарматывы і памеры яе фінансавання з бюджэту.

131. Установа самастойна ажыццяўляе аператыўны ўлік вынікаў дзейнасці, прадстаўляе ва ўстаноўленым парадку статыстычную справаздачнасць, налогавую справаздачнасць, а таксама аператыўную інфармацыю аб выніках гаспадарчай дзейнасці Упаўнаважанаму органу.

132. Аплата законных прадстаўнікоў выхаванцаў за харчаванне дзяцей у дашкольных групах, за сняданкі навучэнцаў здзяйсняецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

133. Установа можа ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку платную дзейнасць па аказанні дадатковых адукацыйных паслуг, не фінансуемых з бюджэту, у адпаведнасці з Палажэннем аб аказанні платных паслуг. Платныя паслугі не могуць быць аказаны ўзамен і ў рамках асноўнай адукацыйнай дзейнасці, фінансуемай з бюджэту.

134. Дадатковымі крыніцамі фінансавання Установы з’яўляюцца:

даходы, атрыманыя ад рэалізацыі прадукцыі, выканання работ і аказання паслуг;

добраахвотныя ахвяраванні юрыдычных і фізічных асоб;

іншыя крыніцы, якія не забаронены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

135. Кошт дадатковых адукацыйных паслуг вызначаецца ў адпаведнасці з улікам эканамічна абгрунтаваных затрат і зацвярджаецца эканамічнай службай Упаўнаважанага органа.

136. Грашовыя сродкі, атрыманыя ў выніку ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці, у тым ліку аказання платных паслуг, паступаюць у самастойнае распараджэнне Установы, улічваюцца і расходуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

137. Умацаванне, абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы ажыццяўляецца за кошт бюджэтных сродкаў, а таксама сродкаў, якія атрыманы ў выніку аказання платных адукацыйных паслуг, пазабюджэтнай дзейнасці, добраахвотных ахвяраванняў фізічных і юрыдычных асоб, а таксама сродкаў іншых відаў дзейнасці, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

138. Спонсарамі Установы могуць быць індывідуальныя прадпрымальнікі, юрыдычныя асобы, а таксама іншыя асобы, зацікаўленыя ў развіцці Установы, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 10
## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

139. Установа мае права па ўзгадненні з Упаўнаважаным органам устанаўліваць сувязі з органамі кіравання адукацыяй і адукацыйнымі ўстановамі замежных краін, міжнароднымі арганізацыямі, фондамі, у мэтах абмену вопытам, правядзення сумесных мерапрыемстваў, аздараўлення навучэнцаў і выхаванцаў.

140. Установа мае права па ўзгадненні з Упаўнаважаным органам заключаць пагадненні з замежнымі адукацыйнымі ўстановамі аб абмене педагагічнымі работнікамі.

141. Міжнароднае супрацоўніцтва Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь на прынцыпах незалежнасці, роўнасці, узаемнай выгады і павагі, і не павінна наносіць шкоду суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, нацыянальнай бяспецы і інтарэсам асобы, грамадства і дзяржавы.

## ГЛАВА 11
## ПАРАДАК КАНТРОЛЮ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ

142. Установа вядзе ва ўстаноўленым парадку справаводства, архіў, статыстычную справаздачнасць, дае звесткі, прадугледжаныя дзеючымі нарматыўнымі дакументамі, у адпаведныя дзяржаўныя органы.

143. Установа нясе адказнасць за своечасовае прадастаўленне падатковай, статыстычнай справаздачнасці, выкананне даведзеных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, мэтавых паказчыкаў па энергазберажэнні паліўна-энергетычных рэсурсаў.

144. Дзяржаўны кантроль за дзейнасцю Установы ажыццяўляе Упаўнаважаны орган і іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

145. Установа ажыццяўляе самакантроль за забеспячэннем якасці адукацыі – комплексны аналіз адукацыйнай дзейнасці, які ўключае самаправерку, самаацэнку адукацыйнай дзейнасці.

Парадак і перыядычнасць самакантролю за забеспячэннем якасці адукацыі вызначаецца дырэктарам Установы.

146. Акрэдытацыя і пацвярджэнне акрэдытацыі Установы ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

147. Бухгалтарскі ўлік Установы вядзецца ДУ “Валожынскі раённы цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый” на аснове заключанага дагавора.

## ГЛАВА 12
## ПАРАДАК ЛІКВІДАЦЫІ І РЭАРГАНІЗАЦЫІ УСТАНОВЫ

148. Рэарганізацыя і ліквідацыя Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

149. Установа лічыцца ліквідаванай з моманту выключэння яе з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь.

150. Рашэнне аб рэарганізацыі або ліквідацыі Установы прымаецца Заснавальнікам на падставе ацэнкі наступстваў такой рэарганізацыі або ліквідацыі з улікам колькасці асоб, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі на тэрыторыі адміністратыўна-тэрытарыяльнай адзінкі, і колькасці дзяржаўных устаноў, якія рэалізуюць праграмы дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі на гэтай тэрыторыі.

151. Пры рэарганізацыі або ліквідацыі Установы, як правіла па заканчэнні навучальнага года, Заснавальнік забяспечвае перавод навучэнцаў і выхаванцаў у іншыя ўстановы з іх згоды, згоды законных прадстаўнікоў навучэнцаў і выхаванцаў у парадку, які ўстаноўлены Урадам Рэспублікі Беларусь.

152. Заснавальнік працаўладкоўвае педагогаў Установы, якія застаюцца без працы, у сувязі з ліквідацыяй або рэарганізацыяй.